Надвор'е

# Сонечна, але ўжо без цяпла

## А ў нядзелю на паўднёвым захадзе — да плюс 20 градусаў

**На працягу ўсяго тыдня ў нас будзе холадна. А ўсё таму, што на тэрыторыю краіны зробіць набег скандынаўскі антыцыклон. Адно добра — на працягу гэтых дзён будзе практычна без дажджоў, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Аднак антыцыклон прынясе і суперхалодныя ночы. У гэты час пры ясным небе чакаюцца замаразкі. У канцы рабочага тыдня на поўдні краіны адаб'ецца ўплыў больш цёплай і вільготнай паветранай масы, а ў выхадныя дні атмасферныя франты, якія сцсоўваюцца з боку Заходняй Еўропы, абумовяць кароткачасовыя дажджы.

Ужо заўтра ўдзень будзе пераважна без ападкаў. Уначы на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца замаразкі да мінус 3 градусаў, месцамі тэмпература паветра складзе 1—6 градусаў вышэй за нуль. Удзень будзе ад плюс 8 да плюс 15 градусаў, па паўднёвым захадзе — 16—17 цяпла. Таксама будзе практычна суха і ў чацвер, толькі па паўднёвым захадзе краіны ў асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 цяпла, месцамі, у асноўным па паўночным усходзе краіны, магчымыя замаразкі да мінус 3 градусаў, удзень будзе 10—16 цяпла. У паўднёва-заходніх раёнах краіны будзе значна цяплей: уначы — ад плюс 9 да плюс 10 градусаў, удзень — 17—18 цяпла.

У пятніцу, 27 верасня, будзе таксама пераважна без ападкаў, толькі па поўдні краіны месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 цяпла, па паўднёвым захадзе — да плюс 10 градусаў, месцамі, у асноўным па паўночным усходзе краіны, магчымыя замаразкі да мінус 3 градусаў. Удзень будзе ад плюс 11 да плюс 18 градусаў.

Па папярэдніх прагнозах айчынных сіноптыкаў, у суботу надвор'е пагоршыцца. А ўсё таму, што атмасферны фронт абумовіць уначы і раніцай па захадзе, удзень — на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—8 цяпла, па ўсходзе месцамі магчымыя замаразкі да мінус 2 градусаў, удзень будзе ад плюс 12 да плюс 18 градусаў. Па паўднёвым захадзе краіны ноччу чакаецца 9—10 цяпла, удзень — ад плюс 19 да плюс 20 градусаў. У нядзелю месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ноччу складзе 5—12 цяпла, а ўдзень будзе ад плюс 13 да плюс 18 градусаў, а па паўднёвым захадзе краіны — нават да плюс 20 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# БАТАРЭІ ПАЧАЛІ НАГРАВАЦЦА

**У сталічных дзіцячых садках. Пра гэта паведамілі ўчора ў Мінгарвыканкаме. Чакаецца, што з сённяшняга дня цяпло пачнуць даваць і ў сталічнае жыллё, і на працягу пяці дзён усе кватэры Мінска павінны нагрэцца.**

Пацяплела ўчора і ў сацыяльных аб'ектах Віцебскай вобласці. Уключаць ацяпленне ў жыллі тут пакуль не плануюць і падкрэсліваюць, што ўлады кожнага раёна будуць прымаць рашэнне аб пачатку ацяпляльнага сезона самастойна, зыходзячы з умоў надвор'я.

Цяпло прыйшло і ў дзіцячыя садкі, школы і бальніцы Магілёўшчыны. Адпаведнае рашэнне тут прынялі мясцовыя ўлады. А з сённяшняга дня плануюць даць цяпло ў сацыяльных аб'ектах Гродзенскай вобласці. Як адзначылі ў аблвыканкаме, усе аб'екты ЖКГ і сацыяльнай сферы вобласці атрымалі пашпарты гатоўнасці да ацяпляльнага перыяду.

Тым не менш, як паведаміў **прэс-сакратар Мінжылкамгаса Генадзь АКСЦІЛОВІЧ,** пакуль у міністэрства не паступала афіцыйнай інфармацыі пра падключэнне цяпла ў краіне.

Тэмпература паветра праз некалькі халодных дзён мінулага тыдня ў кватэрах ужо апусцілася да 17 градусаў і ніжэй, аднак гэта не значыць, што яна не адпавядае дапушчальным крытэрыям.

— 18 градусаў — норма цяпла ў кватэрах у ацяпляльны перыяд, а ў міжацяпляльны перыяд нормы не існуе, — адзначыў Генадзь Аксціловіч.

Нагадаем, што прыняць рашэнне аб пачатку ацяпляльнага сезона ў жыллёвым фондзе мясцовыя органы ўлады ў адпаведнасці з ТКП 388-2012 маюць права, калі на працягу пяці дзён запар сярэднясутачная тэмпература складае не больш за восем градусаў.

Першымі, як заўжды, падключаюць цяпло ў дзіцячых садках, школах, бальніцах, музеях, дзяржаўных архівах, бібліятэках. Батарэі тут павінны награвацца, калі сярэдняя тэмпература пяць сутак трымаецца на ўзроўні +10. У наступную чаргу «ўключаюць» жылыя дамы, інтэрнаты, гасцініцы, навучальныя ўстановы, басейны, лазні і тэатры. Трэцяя катэгорыя аб'ектаў: адміністрацыйныя будынкі і прадпрыемствы атрымліваюць цяпло самыя апошнія. Пры ўмове, што яны маюць пашпарты гатоўнасці або акт праверкі гатоўнасці да работы ў асенне-зімовы перыяд і пасля пачатку ацяплення ў жыллі.

**Ірына СІДАРОК.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ЗША ўзмацняюць ваенны кантынгент на Блізкім Усходзе



Злучаныя Штаты абвяцаюць перакідваць на Блізкі Усход дадатковыя войскі і ваенную тэхніку для размяшчэння ў Саудаўскай Аравіі і Аб'яднаных Арабскіх Эміратах. Па словах кіраўніка ваеннага ведамства Марка Эспера, такім чынам ЗША адрэагавалі на ўдар з выкарыстаннем беспілотнікаў па нафтавых прадпрыемствах Саудаўскай Аравіі. «Гэта першы крок, які мы робім у адказ на гэтыя атакі для таго, каб дапамагчы ўмацаваць абарону Саудаўскай Аравіі, даць тэхніку як Саудаўскай Аравіі, так і ААЭ. Па-другое, мы робім гэта, каб забяспечыць свабодны гандаль праз праліў. І, нарэшце, па-трэцяе — наша задача абараняць сусветны парадак, заснаваны на правілах. Гэта яшчэ і спроба пераканаць іранцаў вярнуцца на шлях дыпламатыі», — адзначыў Эспер. Пры гэтым ён запэўніў, што ЗША не жадаюць ваяваць з Іранам. Узмацненне носіць абарончы характар, амерыканскія войскі будуць у асноўным адказваць за супрацьпаветраную і супрацьракетную абарону. Па словах кіраўніка Камітэта начальнікаў штабоў Узброеных сіл ЗША генерала Джозэфа Данфарда, гаворка ідзе аб сотні салдат, але не аб тысячах.

## У Албаніі зафіксавана каля 300 падземных штуршкоў

297 падземных штуршкоў зафіксаваныя на тэрыторыі Албаніі за суткі, паведамляе ТАСС са спасылкай на паўночнамакедонскае інфармацыйнае агенцтва МІА. Больш за ўсё пацярпелі сталіца Албаніі Тырана, горад Дурэс, размешчаны на ўзбярэжжы Адрыятычнага мора, а таксама населеныя пункты Паградэц, Фіеры і шэраг гарадоў у паўднёва-заходняй частцы Паўночнай Македоніі. Серыя землятрусаў, якія сталі наймацнейшымі ў краіне за апошнія 30 гадоў, выклікала паніку ў насельніцтва, людзі пачалі пакідаць дамы. Жыхары Тыраны і Дурэса правялі ноч на вуліцах, а таксама ў шасці спецыяльна арганізаваных цэнтрах. Паводле апошніх даных, пацярпела звыш 100 чалавек. Паведамляецца пра 569 пашкоджаных будынкаў, у тым ліку школы, медыцынскія цэнтры і жылыя дамы, паведамляе выданне Albanian Daily News. У шэрагу населеных пунктаў краіны была адключана электрычнасць, адсутнічала мабільная сувязь. Паліцыя прыведзена ў поўную гатоўнасць.

## У Іспаніі адзначылі 500-годдзе першага кругасветнага плавання

Урачыстая цырымонія прайшла ў порце Санлукар-дэ-Барамеда. На ваду быў спушчаны вянок у памяць аб тых, хто з гістарычнага плавання не вярнуўся. З гэтага порта ў 1519 годзе на чале з партугальскім мараплаўцам Фернанам Магеланам выйшлі судны «Трынідад», «Сан-Антонія», «Сант'яга», «Кансэпсіён» і «Вікторыя». Як і Калумб, Магелан верыў у тое, што зямля круглая, і падарожжа на захад прывядзе на Усход. Флатылія прайшла ўздоўж атлантычнага ўзбярэжжа Паўднёвай Амерыкі, абагнула Новы Свет з поўдня па праліве, цяпер ён вядомы як Магеланаў, і выйшла ў Ціхі акіян. Магелан загінуў у сутычцы з мясцічамі на Філіпінскіх астравах. Падарожжа 6 верасня 1522 года завяршыла толькі «Вікторыя» пад камандаваннем Хуана Себасцьяна Элькана. Прывезеныя вострыя прыправы акупілі страту астатніх суднаў.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

# СУМА НА ЎТРЫМАННЕ ШКОЛЬНІКАЎ ПЕРАГЛЕДЖАНА

**З 2020 года ў Беларусі павялічацца нарматывы выдаткаў на аднаго навучэнца ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.**

Згодна з пастановай Савета Міністраў ад 18 верасня 2019 года № 629, уносяцца змяненні ў Палажэнне аб планаванні выдаткаў мясцовых бюджэтаў на фінансаванне дзяржустаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Для школ, размешчаных у гарадах, пасёлках гарадскога тыпу, нарматывы на навучанне і выхаванне аднаго школьніка вырастуць да 1954,8 рубля ў год, у сельскіх населеных пунктах — да 4463,87 рубля. Раней нарматывы складалі 1667,92 і 3808,76 рубля ў год адпаведна.

Нарматыў уключае выдаткі на рэалізацыю адукацыйных праграм агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі, у тым ліку выдаткі на аплату працы педагагічных работнікаў, выхадныя дапамогі, камандзіроўкі, аплату сувязі, транспартных паслуг, іншыя бягучыя выдаткі.

Таксама перагледжаны карэктуючыя каэфіцыенты, якія прымяняюцца да нарматыву выдаткаў на навучанне і выхаванне аднаго навучэнца ў залежнасці ад размяшчэння ўстановы адукацыі, яе тыпу, колькасці навучэнцаў, наяўнасці/адсутнасці басейна, магчымасці наведваць групу падоўжанага дня і іншых абставін.

Асноўныя палажэнні пастановы набудуць сілу 1 студзеня 2020 года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# УСЮ ВОСЕНЬ НА МАНЕЖЫ

**Гран-пры II Мінскага міжнароднага фестывалю цыркавога мастацтва, што праходзіў 19—22 верасня, атрымалі артысты з Расіі — атракцыён з белымі тыграмі «Шамбала» пад кіраўніцтвам Сяргея Несцерава.**


circus.by.

Золата — у паветранага эквілібра «Віртуозная пяцёрка» пад кіраўніцтвам Уладзіміра Плотнікава (Расія) і «Канатаходцаў» з Нацыянальнага цырка Пхеньяна (КНДР). Сярэбраныя ўзнагароды фестывалю дасталіся ўкраінскім паветраным гімнастам у кольцы Марыне Главацкіх і Аляксею Грыгараву, а таксама акрабатам на сустрэчных арэлях з Расійскай дзяржаўнай цыркавой кампаніі (нумар «Вышэй за аблокі» пад кіраўніцтвам Аляксандра Скокава). У ліку бронзавых прызёраў — беларускія гімнасткі на трапецыі Анастасія Дончанка і Анастасія Пуцята з Белдзяржцырка, нумар «Свабодны дрот» кітайскага артыста Лі Вэй, акрабаты на «Пераходнай лесвіцы» з Казахскага дзяржаўнага цырка і сола-эквілібрыст на палках Раман Хаперскі з Маскоўскага цырка Нікуліна на Цвятным бульвары. Раздалі свае прызы таксама журы: глядацкае, грамадскае і дзіцячае, а расійскі атракцыён «Забаўныя мядзведзі» пад кіраўніцтвам Таццяны і Андрэя Яравых атрымаў асобную ўзнагароду старшыні Мінгарвыканкама.

Нагадаем, сёлета ў мінскім фестывалі ўзялі ўдзел каля 100 артыстаў з 18 краін свету, а ацэньвалі прадстаўленыя ва ўсіх жанрах нумары прафесіяналы — аўтарытэтныя прадзюсары, рэжысёры, дырэктары сусветна вядомых цыркаў. Найлепшыя, па версіі суддзяў і гледачоў, выступленні будуць уключаны ў новую праграму «Брава!», якая пачнецца ў Белдзяржцырку ўжо з 27 верасня і будзе паказвацца да 8 снежня.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

# АЎТАКРАН УПАЎ У КАТЛАВАН

**А 21-й гадзіне сталічным ратавальнікам паступіла паведамленне пра падзенне аўтамабільнага крана на вуліцы Караля.**

Калі падраздзяленні МНС прыбылі да месца выкліку, было ўстаноўлена, што ў 18.30 пры правядзенні работ па перамяшчэнні металічнай апалубкі на тэрыторыі будаўніцтва трэцяй лініі Мінскага метрапалітэна адбылося падзенне аўтамабільнага крана ў катлаван глыбінёй 25 метраў. У выніку пацярпеў машыніст аўтакрана, які, знаходзячыся ў кабіне кіравання, у момант падзення выскачыў у катлаван. З папярэднім дыягназам «пералом» ён быў дастаўлены ў бальніцу.

Механічныя пашкоджанні атрымалі аўтакран і часовы ўпор для стабілізацыі сцяны катлавана. Прычына здарэння высвятляецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**